**Д. А. Тракала**

# ВОБРАЗ НОВАЙ ЖАНЧЫНЫ КІТАЯ Ў ТВОРЫ ЧЖАН АЙЛІН «ЧЫРВОНАЯ РУЖА, БЕЛАЯ РУЖА»

Вобраз “новай” жанчыны актуальны не толькі ў кітайскім грамадстве пачатку 20-га стагоддзя, але і ў сучасным, сведчаннем чаму з’яўляецца творчасць Мо Яня, Чжан Цзе, Дзін Лін і Лу Вэньфу. Прадстаўленае даследаванне дазваляе прасачыць асаблівасці мастацкага асэнсавання вобразу “новай” жанчыны ў прыгожым пісьменстве КНР у цэлым, выявіўшы пры гэтым спецыфіку раскрыцця дадзенай тэмы ў творчасці Чжан Айлін.

Сярод важных асаблівасцей жаночых вобразаў Чжан Айлін вылучаецца іх цесная сувязь з біяграфіяй пісьменніцы. Многія рысы характару і бытавыя сітуацыі, у якіх аказваюцца гераіні, не з'яўляюцца плёнам аўтарскай выдумкі, а адлюстроўваюць жыццёвы вопыт самой пісьменніцы або яе бліжэйшага

акружэння. У творах можна убачыць сутнасць камуністычнага ладу КНР, актуальныя тагачасныя грамадскія праблемы, адной з якіх з'яўляецца саслоўнае і патрыярхальнае ўладкаванне традыцыйнага Кітая.

Раман «Чырвоная Ружа, белая Ружа» (1944) напісаны ў звыклым для Чжан Айлін стылі. Пісьменніца тонка перадае ўсе дэталі ўзаемаадносін людзей і шлях іх развіцця; апісвае праблемы, якія ўзнікаюць з-за кансерватыўнага грамадства, а таксама закранае ўплыў заходняй культуры, якая пасля і прыводзіць да трансфармацыі жаночага вобраза. Аднак важнай асаблівасцю гэтага твора з'яўляецца тое, што роля галоўнага героя, які дае імпульс развіццю вобраза "новай" жанчыны, адводзіцца мужчыне.

Вызначана, што ў рамане «Чырвоная Ружа, белая Ружа», характэрныя рысы гэтага вобраза пачынаюць прасочвацца дзякуючы ўздзеянню мужа гераіні, які, знаходзячыся доўгі час за мяжой, пераняў заходнія традыцыі і лад жыцця. Гэтыя акалічнасці і сфарміравалі прыдатную глебу для трансфармацыі карціны свету дзяўчыны з традыцыйна кітайскім выхаваннем.

Такім чынам, на прыкладзе гераіні рамана Чжан Айлін дэманструе эвалюцыю жаночага вобраза: ад жанчыны сціплай, пачцівай, падатлівай, якая беспярэчна падпарадкоўваецца патрыярхальнай мадэлі сямейных адносін, да жанчыны, якая, пераадольваючы выклікі лёсу, перамагаючы шэраг праблем і зневажанняў, ціск мужа і неразуменне грамадства, паступова змяняецца, каб у крытычны і цяжкі момант стаць новай версіяй сябе. Той свабоднай, праніклівай, поўнай рашучасці і сілы жанчынай, што не хаваецца за іншымі людзьмі, не баіцца адказнасці і асуджэння. Гераіня Чжан Айлін, праходзячы праз працэс асобаснай трансфармацыі, вучыцца падладжваць абставіны пад сябе, робіць усё магчымае, каб атрымаць прызнанне і сфарміраваць трывалую глебу для далейшага развіцця і самасцвярджэння, дэманструючы актыўную валявую пазіцыю.